Малейка С.У., студ. гр. 439 ФІДК
БДУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Тычко Г.К.,
докт. філал. навук, прафесар

# ТВОРЧАСЦЬ В.ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА: СУЧАСНАЕ ПРАЧЫТАННЕ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адным з пачынальнікаў новай беларускай літаратуры па праву лічыцца В. Дунін-Марцінкевіч. Ул. Сыракомля вызначаў творы “народнага паэта як “феномен”, “варты ўвагі з таго менавіта погляду, што Марцінкевіч, першы ўзяўшы ў свядомыя рукі беларускую дуду нашага народа, здабыў з яе песьню, якую народ зразумеў, а хатняе рэха паўтарыла…” (1, с. 123). Пачатак творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча прыпадае на 40-я гг. XIX ст., калі ў Вільні была апублікавана яго першая п’еса “Сялянка”. Літаратурна-мастацкі ўзровень гэтага твора сведчыў, што пісьменнік ужо меў пэўны прафесійны вопыт. Як па сваім змесце, так і па форме, першы драматургічны твор Марцінкевіча насіў яшчэ характар пераймання. Ён вытрыманы ў духу папулярных у польскай перадрамантычнай літаратуры сентыментальных ідылій. Выразны адыход В.Дуніна-Марцінкевіча ад сентыментальных традыцый прыкметны ў структуры і праблематыцы яго твораў: у іх даволі паслядоўны, лагічны сюжэт, вострая канфліктнасць, імкненне ўзняцца да асэнсавання некаторых актуальных з’яў гістарычнай рэчаіснасці, паглыбленая ўвага да этнаграфічна-бытавых праяў народнага жыцця, што абумоўлена арыентацыяй пісьменніка на традыцыі славянскага рамантызму. Ідэя вызвалення чалавечай асобы з-пад ярма феадальнага прыгнёту і самавольства найбольш яскрава выяўлена ў першых дзвюх песнях аповесці “Гапон”, якія распавядаюць аб драматычнай гісторыі кахання Гапона і Кацярыны. Вылучаючы на першы план шчырасць і непасрэднасць герояў, іх вальналюбства, імкненне да шчасця і незалежнасці, знешнюю прывабнасць і душэўную прыгажосць, аўтар тым самым сцвярджаў

заканамернасць імкненняў простага чалавека да асабістага шчасця і свабоды. Такім чынам, ужо на гэтым этапе творчасці ў В. Дуніна-Марцінкевіча зараджаецца імкненне паказаць жыццё такім, якім яно існуе на самой справе, без прыхарошвання, што знаменавала паступовы пераход ад Марцінкевіча-сентыменталіста да Марцінкевіча-рэаліста.

Найбольш яскрава талент пісьменніка як рэаліста праявіўся зноў-такі ў драматургіі. Рашаючым фактарам паглыблення рэалістычнай асновы і крытычнага пафасу твораў з'явілася сама паслярэформенная рэчаіснасць, асаблівасці тагачаснага грамадска-палітычнага жыцця. Прычыну гэтага ў першую чаргу неабходна шукаць у паўстанні 1863-1864 гг., за ўдзел у якім В. Дунін-Марцінкевіч знаходзіўся пад наглядам паліцыі да канца жыцця.

Р. Зямкевіч зазначае: "…Сам Марцінкевіч у часе паўстання хоць нічым яго не падтрымліваў і не згаджаўся з ім, быў, аднак, арыштаваны і прасядзеў колькі месяцаў у вастрозе за тое, што яму як беларускаму пісьменніку прыпісвалі ўсе беларускія праклямацыі, якія тады хадзілі з рук у рукі…" (4, с. 110). Можна сцвярджаць з пэўнай доляй упэўненасці, што іменна гэты факт і стаў штуршком для далейшага расчаравання ў тагачаснай рэчаіснасці. Творы яго не друкаваліся, былі забаронены. Большасць з іх В. Дунін-Марцінкевіч "пісаў у стол". "Галоўнае ў забароне працы Дуніна-Марцінкевіча заключалася не ў змене цэнзараў, а ў агульным узмацненні цэнзурнай і русіфікатарскай палітыкі царскіх улад" (4, с. 108-109).

"Пінская шляхта" рашуча выдзяляецца з усіх твораў, раней напісаных Марцінкевічам. Зусім не так, як раней, глядзіць ён на мілую ягонаму сэрцу шляхту, на прадстаўнікоў царскай улады – паліцэйскіх, судовых чыноўнікаў…" (5, с. 57). Грамадска-палітычная актуальнасць праблематыкі "Пінскай шляхты" заключалася ў тым, што якраз у паслярэформенны перыяд на Беларусь хлынула цэлая плойма дробнага чыноўніцтва на чале з больш буйнымі сатрапамі з мэтай не толькі "умиротворить" узбунтаваны край, але і пажывіцца за кошт падману і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

хабарніцтва. Гэтаму ў значнай ступені спрыяла страшэнная запалоханасць насельніцтва заняволенага краю, асабліва яго вясковых жыхароў – сялянства і дробнай засцянковай шляхты. Вобразы царскіх чыноўнікаў – станавога прыстава Кручкова і пісара Пісулькіна падаюцца ў п’есе Марцінкевіча ў рэзка адмоўных, сатырычных танах. Найбольш яскрава нахабніцтва, дэмагогія, хабарніцтва гэтых прадстаўнікоў царскай Феміды выступаюць у сцэне “расследования уголовного дела о побоях, нанесеных Ціхоном Протосавіцкім Івану Цюхаю-Ліпскому”. “…Драматург вельмі добра даводзіць, што панаванне кручковых толькі і магчыма сярод цёмнай, непісьменнай, але пыхлівай шляхты, кола жыццёвых інтарэсаў якой абмежавана няхітрым побытам, выпіўкай, закускай ды яшчэ патрэбай уяўнай велічы…” (5, с. 59).

У рэзка адмоўных, з’едліва-сатырычных тонах паказваецца цемра і саслоўны кансерватызм пінскай шляхты, якая за свой уяўны шляхецкі гонар гатова ісці на любое прыніжэнне і ахвяру. Усе жыхары шляхецкага засценка слепа падпарадкоўваюцца рашэнням і здзеклівым капрызам “найяснейшай кароны”. Пінская шляхта выступае ў п’есе як сімвал векавой адсталасці, грамадскай пасіўнасці і кансерватызму, якія непазбежна нараджаюць атмасферу дэспатызму, сляпога падпарадкавання і самавольства. Хабарніцтва і падхалімства ўвайшлі ў шляхецкі лад жыцця, сталі асновай яго этыкі і маралі.

Актуальнасць сапраўднай творчасці не губляецца з гадамі. Праблемы, якія ўзнімае аўтар у сваіх творах, хвалююць чытача і сёння. Адна з цэнтральных тэм у “Пінскай шляхце” – страта сваёй нацыянальнай годнасці, абнішчэнне спрадвечных маральных каштоўнасцяў. “…Шляхта з’іначылася, здрабнела, ад былой велічы, шырыні душы застаўся толькі непамерны гонар, пыха, ніякімі рэальнымі заслугамі не падмацаваныя. Ад агню застаўся толькі дым…” (5, с. 59). Сцэнічнае жыццё “Пінскай шляхты” пачалося толькі ў паслякастрычніцкія гады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2008 г. споўнілася 200 гадоў з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, і той год быў аб'яўлены ЮНЭСКА годам беларускага пісьменніка. У тым жа годзе на сцэне тэатра імя Я. Купалы рэжысэр Мікалай Пінігін паставіў спектакль “Пінская шляхта”. Сатыру Дуніна-Марцінкевіча на беларускую шарачковую шляхту і на царскіх чыноўнікаў-кручкатвораў Мікалай Пінігін выводзіць на гістарычную драму цэлага народу. Перад намі паўстае ўжо не той “Северо-Западный край”, пра які пісаў Марцінкевіч, перад намі – сучасная Беларусь. Аўтар пастаноўкі даносіць нам новую ідэю твора, імкнецца па-новаму прачытаць твор. Атрымаць фармальную незалежнасць – гаворыць М. Пінігін – не значыць стаць свабодным. З новага боку паўстаюць цяпер героі п’есы. Так, Кручкоў — не проста карупцыянер. Ён імкнецца быць цэнтрам свету. Ён і суддзя, ён і сват, ён і найважнейшы ўдзельнік любой падзеі. Кручкоў атрымлівае асалоду ад магчымасці вырашаць лёсы людзей. Ён – увасабленне моцнага, нават, жорсткага чалавека, чыноўніка, які мае магчымаць і фармальнае права паказаць сваю сілу, неабмежаваную магчымаць караць і мілаваць тады, калі яму гэтага захочацца.

Пара закаханых – Марыся і Грышка – своеасаблівыя «нашчадкі» галоўных герояў «Ідыліі». Людзі новага пакалення, яны ўжо не ідэалізуюць родную зямельку, а наадварот, напрыканцы спектакля рашуча з’язджаюць з гэтага шляхецкага «раю». У іх паводзінах добра праглядаецца стыль мыслення пэўнай часткі нашай моладзі. Так раскрывае рэжысёр яшчэ адну надзвычай вострую сацыяльную праблему сучаснай – незалежнай – Беларусі. Бадай, самы востры і напружаны момант у спектаклі – бойка шляхты, якая перарастае ў сапраўднае жудаснае кровапраліцце. Пры гэтым сапраўдны віноўца гэтай трагедыі застаецца збоку ад таго, што сам і ўчыніў.

Такім чынам, з драмы людзей пэўнага класа, пра якую пісаў Марцінкевіч, М.Пінігін выводзіць сапраўдную трагедыю ўсёй сучаснай Беларусі. Сапраўднае мастацтва якраз і вызначаецца тым, што застаецца актуальным заўсёды.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Гісторыя беларускай літаратуры: 19-пач.20 ст.: падручнік; Пад агул. Рэд. Лазарука М.А., Семяновіча А.А.- 2-е вад., дапрац.-Мн: Выш. шк., 1998.-560с.

2. Кісялёў, Г. В. Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча:спроба навуковай сістэматызацыі дакументаў і матэрыялаў. – Мн.: Універсітэцкае, 1988. – 160 с. – (Са скарбніцы беларускай культуры).

3. Майхровіч С. Дунін-Марцінкевіч.-Мн, Дзяржвыд. БССР,-1995-210с.

4. Макарэвіч, А. М. Ацэнкі творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча на рубяжы стагоддзяў'/А. М Макарэвіч//Веснік МДУ імя А. А. Куляшова. – 2008. - № 4 (31). – С.123-127.

5. Голуб, Т. С. Шчодры "сейбіт беларускасці": В. Дунін-Марцінкевіч у ацэнцы Максіма Гарэцкага/Т. С. Голуб// . - С.197-201.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ